Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

СЛОВА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12, m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зал. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрасу 20 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 8 Вільня, Субота 27-га кастрычніка 1928 г. Год 1

Да апошніх падзеяў у Віленскай Беларускай Гімназіі.

Па дзікім выпадку пасьля не фэртуннай лекцыі Я. Станкевіча ў салі Віленскай Беларускай Гімназіі 14-га гэтага месяца, аб чым паведамлялася ў хроніцкай заметцы папярэдняга нумару „Слова Працы“, здавалася, што сьцены Гімназіі будуць пазбаўлены на будучыню ад магчымасьці паўтарэньня падобных дзікіх інцыдэнтаў. Але відаць, што горкі волыт ня ўсіх чамусьці навучыў, бо роўна цераз тыдзень, 21 гэтага-ж месяца, Гімназія ізноў стала арэнай палкавых распраў з вучнямі.

Повадам да гэтага скандалу паслужылі тыя-ж самыя прычыны, што і ў першым выпадку. Відаць, нечая скрытная рука ізноў пакіравала лекцыі ў салі Гімназіі так, каб стварыць умовы для спатканьня вучняў з нялюбімым і праціўным ім „лектарам“ Я. Станкевічам, хвараблівы (калі ня дзікі) гонар якога быў скампрамітаваны „неадпаведным“ захаваньнем гадунцоў гімназіі. У гэты раз на помач лектару прышлі, ня толькі тоўстая ляска яго, але некаторыя сябры пэдагагічнае рады і адміністрацыі гімназіі, бо ў выніку гэтага выпадку 4 вучні былі па загаду інспэктара выкінуты з гімназіі і бяз ведама Дабрадзейнага Таварыства пазбаўлены карыстаньня супольнай кухняй вучнёўскага інтэрнату.

Калі выведзеная з цярпеньня цэлая кляса стала ў абароне нявінных сваіх калегаў (якія звольнены па ўказцы Станкевіча) і разам з звольненымі вучнямі пакінула ў часе заняткаў клясу, сітуацыя ў Гімназіі на столькі аслажнілася, што трэба было зрабіць некалькі экстрэнных паседжаньняў пэдагагічнае рады і бацькаўскага камітэту.

Быццам „alibi“ вучняў на супольных паседжаньнях бацькоў і пэдагогаў было даведзена, бо звольненым вучням ізноў дазволілі хадзіць на гімназіяльныя заняткі і карыстацца інтэрнатам, а спраўцы гэтага скандалу прымушаны былі паддацца да дымісіі.

Ня ўходзячы ў падрабязныя крытэрыі прычынаў гэтага сумнага зьявішча ў сьценах школы, трэба адзначыць, што гэта ўсе рабілася для „чагосьці“ сьвядома. Пэратасоўка ў парадку лекцыяў, запрашэньне такога „лектара“, як Станкевіч і само спатканьне яго з вучнямі, якія па—дзяцінаму ня могуць хаваць сваей агіды да яго лектарскай бяздарнасьці, гаворыць, што камусьці трэба гэтыя скандалы.

Думаем, што вучні нарэшце зразумеюць чорную працу нашае санацыі і надалей будуць ухіляцца ад кампраматацыі сваей Гімназіі, на што пхаюць розныя чорныя падпольныя сілы, імя якой санацыя.

Разрыў (?) польска-нямецкіх гаспадарчых перагавораў.

Тое, што можна было прадбачыць, здарылася: польска-нямецкія гаспадарчыя перагаворы ізноў перарваліся.

У апошні час нямецкі ўрад зьвярнуў асаблівую ўвагу на справу перагавораў з Польшчай. 10—11 адбыліся нарады габінэту ў гэтай справе, на якія былі заклікаваны — нямецкі пасол у Варшаве Раўшэр і старшыня нямецкай дэлегацыі Гэрмэс. Быццам Гэрмэс даводзіў і рашуча радзіў ураду перарваць на неабмяжаваны час перагаворы, якія зьяўляюцца безнадзейнымі з прычыны няўступлівасьці Польшчы. Раўшэр, быццам, наадварот—прапанаваў паразуменьне. У выніку нарады Гэрмэс паехаў у Варшаву, перагаворы распачаліся ізноў, але на першым-жа абмене пагдядаў высьветліліся такія розьніцы, што Гэрмэс раптам ізноў выехаў у Бэрлін... Уражаньне ад гэтага выезду было вялізарнае, дый ня толькі ў Польшчы і ў Нямеччыне, але і ў іншых дзяржавах, заінтэрэсаваных так ці інакш у польска-нямецкіх адносінах.

Выезд Гэрмэса азначаў амаль не разрыў перагавораў. Абодва ўрады — нямецкі і польскі — зараз-жа выдалі афіцыяльныя камунікаты, высьвятляючы стан перагавораў і вінавацячы адзін аднаго ў іх перарыве.

Польскае Агенства выдала — пасьля нямецкага — камунікат, палямізуючы з закідамі нямецкага ўраду, ускладаючага віну на польскі. З свайго боку польскі камунікат высьвятляе, што — на прапазіцыю польскай дэлегацыі аб зусім вольным тавара-абмене паміж абодвума краямі—нямецкая дэлегацыя адказала адмовай, заявіўшы, што на вольны (неабмяжаваны ані колькасна ані якасна) увоз польскага вугалься і ўсялякай скаціны (жывой і бітай) нямецкі ўрад не згаджаецца, а будзе надалей для ўсялякага роду гэтых прадуктаў устанаўліваць згары азначаныя і абмяжаваныя „кантынгенты“ (колькасьці). Такі адказ, кажа камунікат, адразу падважыў магчымасьць паразуменьня, бо-ж — за вольны ўвоз у Польшчу нямецкіх тавараў — Польшча не атрымала-б ад Нямеччыны ніякай „кампэнсаты“ (раўнаважніка), які-б дазволіў краю выраўнаваць страты для гандлёвага балянсу краю, — з прычыны дапушчэньня на польскі рынак масы нямецкіх фабрычных тавараў.

Лягічным вывадам з гэтага і зьявіўся перарыў перагавораў, — да часу, калі нямецкі ўрад займе ў споры канчальнае становішча...

Такім чынам, паводле думкі нямецкай дэлегацыі — польска-нямецкі трактат даваў-бы нямецкай прамысловасьці ўсе магчымасьці поўнага апанаваньня польскага рынку, а адначасна зачыняў-бы фактычна (абмяжоўваючы іх у азначаных нямецкіх інтарэсах) нямецкі рынак для тых прадуктаў польскага вывазу, якія зьяўляюцца найважнейшымі „пазіцыямі“ гандлёвага балянсу Польшчы. Інакш кажучы, Нямеччына мае намер накінуць Польшчы такі гандлёвы трактат, які — ня толькі быў-бы аднабока—карысны для Нямеччыны, але проста руйнаваў-бы загранічны гандаль Польшчы, падкопваючы яе краёвую прадукцыю, а потым — і яе валюту...

Польская прэса дадае да гэтага камунікату, што новы канфлікт паміж Нямеччынай і Польшчай мае сваё жарало выключна ў гэтым чыста гаспадарчым споры — бо-ж усе супярэчнасьці так зв. „палітычнага“ характару амаль не цалком узгоднены(?) працай у Юрыдычнай Камісіі. Ці — гэта значыць, што ў-ва ўсіх гэтых справах польскі ўрад уступіў ізноў. Бо-ж, як ведама, нямецкі ўрад рашуча заявіў, што такія сваі дамаганьні, як, напр. вольнага пасяленьня нямецкіх купцоў на прыгранічным абшары польскай тэрыторыі ён лічыць прадуступным варункам для ўсялякага гандлёвага трактату!... Калі гэта так, дык і гэта ўказала-б, як далёка пайшла ўступлівасьць польскага ўраду — на карысьць Нямеччыны.

Калі польска-нямецкі спор абмяжаваўся запраўды толькі абшарам чыста гаспадарчым, тады — ясна, што нямецкай дэлегацыі, а значыць і нямецкаму ўраду, дыктуюць сваю волю нямецкія зямляўласьнікі, асабліва-ж — прускія абшарнікі, „сацыялістычнаму“ ўраду — цяпер — яшчэ больш уладна, як папярэдняму — нацыяналістычнаму!...

Сам старшыня нямецкай дэлегацыі д-р Гэрмэс — ёсьць адначасна старшынёй нямецкіх сялянска-кулацкіх саюзаў,—падобных да пястоўскіх у Польшчы,—якія, як сільныя прадуцэнты сельска-гаспадарчых прадуктаў, асабліва—гадоўлі жывёлы (рагаціны і сьвіньняў) цесна зьвязаны эканамічна і палітычна з буйнейшымі абшарнікамі-нацыяналістамі (як і польскія „вітасавы кулакі“). Такім чынам, чыста гаспадарчы зьмест разрыву польска-нямецкіх перагавораў — у цераносе нямецкіх аграрыяў, якія баяцца канкурэнцыі таннага польскага мяса ўсялякіх гатункаў, якая-б вельмі значна зьбіла цэны на гэтыя прадукты ў Нямеччыне. Ці „сацыялістычны“ нямецкі ўрад запраўды пойдзе цалком у гэтым пад каманду аграрыяў, аддаўшы ім на луп шырокія масы працоўнага мястовага спажыўца, абмяжаваны бюджэт якога заўсёды — яшчэ з часоў Бісмарка — традыцыйна бараніла нямецкая сацыял-дэмакратыя, гэта — вельмі сумліўна. І запраўды апошняя вестка кажа, быццам Гэрмэс ўжо зьмешчаны са становішча старшыні дэлегацыі, а на яго мейсца назначаны віцэ-міністар ральніцтва д-р Посэ. Але, з другога боку, што гэта „зьмена азначае рашучы паварот нямецкага ўраду ў напрамку паразуменьня з Польшчай, таксама сумліўна: залішне востра выступіў нямецкі ўрад у справе перарыву перагавораў — у сваім камунікаце праз Агенцтва Вольфа!

—·—

Ізноў—разглядзімо справу бліжэй. Польскія газэты абураюцца на тое, што „прапазіцыі, якія ставіць Польшчы нямецкая дэлегацыя, ня ёсьць прапазіцыі паміж двума вольнымі і незалежнымі народамі—контрагентамі: гэта хутчэй варункі, дыктаваныя пераможцам пераможанаму“.

Мы ў агульным нарысе высьветлілі раней агульныя прычыны і варункі такога палажэньня справы. Нямецкая прамысловасьць, німала не пацярпеўшая ад вайны, цяпер адбудавалася, як ніякая іншая ў Эўропе. Маючыя найлепшыя, удасканаленыя машыны, немцы могуць заліць Польшчу значна таннейшымі, а таксама значна лепшымі таварамі. Дык вольны доступ іх на польскі рынак, чаго якраз трэбуюць немцы, дый яшчэ—з наймяншымі мытамі — запраўды-ж азначаў-бы амаль не канец польскай прамысловасьці.

Але адначасна немцы—за час гаспадарчай вайны з Польшчай—шмат зрабілі ў галіне самавыстарчальнасьці ў справе выжыўленьня краёвымі сельска-гаспадарчымі прадуктамі!... Дык ламаць усе тое, што зроблена—з вялікім накладам капіталу—за апошнія 3 гады для падняцьця сельскай гаспадаркі—дзеля паразуменьня з Польшчай — Нямеччына ня мае гвалтоўнай патрэбы. Уся справа ў тым і зьмяшчаецца, што Нямеччына можа чакаць шмат часу, ня церпячы так страшэнна, як Польшча ад зацягнуўшайся гаспадарчай вайны...

Лічбы ізноў пакажуць нам, наскольки карысьнейшае ў гаспадарчым канфлікце становішча мае Нямеччына ў параўнаньні з Польшчай.

Паводле аблічэньняў нямецкай статыстыкі—вартасьць польска-нямецкага таварнага абароту—за апошнія 5 гадоў—выглядала ў такіх лічбах:

	Нямецк. ўвоз з Польшчы ў мільён. марак	Нямецк. вываз у Польшчу ў мільён. марак
ў 1923	488.1	396.2
„ 1924	456.6	399.8
„ 1925	457.7	423.3
„ 1926	305.0	261.0
„ 1927	366.8	432.0

З гэтага відаць, што нямецкі ўвоз тавараў з Польшчы перад гаспадарчай вайной быў значна вышэйшы ад цяперашняга. Такім чынам скуткі гаспадарчай вайны з немцамі для Польшчы — вельмі дatклівыя: Польшча ўсьцяж значна траціць з прычыны зачыненьня для яе нямецкага рынку.

Што-ж датычыць нямецкага вывазу ў Польшчу, дык ён — па часовым — на адзін толькі (1926) год!...—рэзкім спадку — цяпер ужо—ня толькі ня зьменшыўся ў параўнаньні з тым, якім ён быў перад гаспадарчай вайной, але навет значна ўзрос!... Гэта значыць, што ніякіх скуткаў гаспадарчай вайны з Польшчай Нямеччына быццам і не адчувае! А ў кожным разе—Нямеччына можа спакойна чакаць далейшай ўступлівасьці з боку Польшчы: — Нямеччына траціць толькі на тым, што яе вываз у Польшчы залішне павольна разьвіваецца—ў стасунку да агульнага страшэнна шпаркага ўзросту нямецкай прамысловасьці і міжнародавага гандлю... Але вельмі нязначная „польская частка“ ў агульным гандлёвым абароне Нямеччыны робіць і гэтыя „страты“ Нямеччыны—вельмі для яе нячутнымі...

Усімі гэтымі лічбамі — пэўне-ж вельмі спрытна апэруе нямецкая прэса. Яна цьвердзіць, што разьвіцьцё гаспадарчай магутнасьці Нямеччыны ідзе такім шпаркім тэмпам дый з такой непераможнай сілай, што яе ня здолеюць стрымаць ніякія муры ці бар'еры, чаго красамоўным доказам і зьяўляецца няўдалая спроба адгарадзіцца такім „мурам“ з боку Польшчы... „Польшча папросту ня можа выключыць сябе з гаспадарчага абшару нямецкіх уплываў“, кажуць нямецкія эканамісты. „Польшча ня можа выключыць з сябе, з свайго гаспадарчага арганізму нямецкага складніка“. „Кожная такая спроба — ня толькі засуджана на няўдачу, але і пагражае Польшчы вялікімі ўстрасеньнямі—катастрофай“!..

„І тутака, піша польскі гаспадарчы аглядчык, гранітавая база меркаваньняў нямецкіх эканамістаў, падстава іх апору, іх няўступлівасьці Польшчы“. „Пашто-ж—запраўды даваць польскаму вывазу „кантынгенты“ — 350.000 тоннаў вугальля штомесячна, 300.000 тоннаў сталі і жалеза штогодна, пашто пускаць з Польшчы ў край прадукты сельскай гаспадаркі, калі ўсё гэта падкопвае нямецкую прадукцыю суадказных галінаў, украпляе гаспадарча і палітычна Польшчу“?! Пашто рабіць усё гэта, калі-ж і без таго польскія рынкі,—з „мытным мурам“, з „ваенна-гаспадарчымі акопамі“, ці бяз іх — аднолькава — адчынены фактычна для „гранатаў“ з нямецкімі таварамі!!!

Вось—дзеля ўсяго гэтага—і цяжка спадзявацца ў хуткім часе на маючых узнавіцца польска-нямецкіх гандлёвых перагаворах якогась рашучага паразуменьня ў справе заключэньня трактату на шырокай падставе, як плянавалася яшчэ нядаўна абедзьвюма старонамі. У найлепшым разе будзе прыдуманы сякі-такі „гаспадарчы мір“, які ня будзе амаль-што нічым розьніцца ад—сучаснай „эканамічнай вайны“...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Калі будзе склікаyы Сойм.

Надовячы ў м. Сойму Дашынскага адбылася нарада старшыняў пасольскіх клюбаў.

Адчыняючы паседжаньне, Дашынскі паведаміў, што ўрад скліча Сойм і Сэнат у канстытуцыйным часе—гэта значыць, у канцы гэтага месяца. Першае паседжаньне гэтай бюджэтнай сэсіі будзе 30—31 г. м.

На тым-жа паседжаньні адбылася доўгая дыскусія на тэму адсьвяткаваньня Соймам 10-ці годзьдзя Незалежнасьці Польшчы. Падана яшчэ некалькі новых праектаў, чым і зачынена паседжаньне.

Пэўна не дагаворацца.

Ужо шосты тыдзень, як у Варшаве йдуць нямецка-польскія „гутаркі“ ў справе нямецка-польскага гандлёвага дагавору. Але, мусіць, гэтыя гутаркі і будуць толькі гутаркамі, бо ад іх справа гандлёвага дагавору нешта нічуць ня йдзе ўперад, а топчацца на адным мейсцы. Найбольш яна стаіць дзеля таго, што заўсёды працавітыя і акуратныя немцы, у гэтых перагаворах нешта „папсаваліся“ — іх старшыня вельмі часта выяжджае з Варшавы ў Бэрлін, дзеля інфармацыі свайго ўраду аб прабегу гутаркаў і дзеля атрыманьня ад яго новых інфармацыяў.

Вось і цяпер, па кароткім пабыце ў Варшаве, старшыня нямецкай дэлегацыі, Гэрмэс, ізноў выехаў у Бэрлін.

Ад'емнасьць польскага гандлю.

Згодна з тымчасовымі аблічэньнямі Галоўнага Статыстычнага Ураду, гандлёвы білянс Польшчы за мінулы верасень выглядае так:

Прывезена тавараў на 272.783 тысячы злотых. Вывезена тавараў на 204.343 тысячы злотых. Ад'емны білянс раўняецца 68.440 тысяч злотых. У параўнаньні з папярэднім (жніўнем) месяцам, ад'емнасьць гандлю пабольшала на 5.999 тысяч злотых.

Зборныя ўмовы ў промысьле.

16 бягучага месяца ў гарнячым промысьле Дамброўскага і Кракаўскага басэйну падпісана зборная ўмова. Умова абавязвае ад 1 верасьня г. году і прызнае акардовым работнікам 4, а падзённым 7 прац. падбаўкі.

Адначасна падпісана зборная ўмова ў мэталёвым промысьле. Яна прызнае работнікам 5 прац. падбаўкі і будзе абавязваць да 1 ліпня 1929 году.

З Лодзкай забастоўкі.

Падаём каротка далейшы працяг агульнай работніцкай забастоўкі ў Лодзі.

16-X у сяродмесьці адбылася маніфэстацыя работнікаў, якую, аднак, паліцыя разагнала. Некалькі чалавек арыштавана. На вуліцах патрулююць вялікія аддзелы пешай і коннай паліцыі з голымі штыхамі.

Забастовачная сітуацыя ў далейшым працягу завастраецца. Фрызьерскі (галярскі) прафсаюз далучыўся да забастоўкі, а галяры першарадных галярняў навет пастанавілі ападаткавацца на карысьць забастоўкі на вялічыну аднадзёвага заработку.

У далейшым працягу дня агульная забастоўка ў Лодзі прыняла яшчэ большыя разьмеры: забаставалі ў поўным камплекце трамвайшчыкі і работнікі гарадзкой газоўні і ўсе іншыя прадпрыемства публічнагы ўжытку, за выняткам толькі аднэй электроўні. Пачалі працу толькі наборшчыкі лодзкіх газэт.

Перад будынкам прафсаюзу валакняных работнікаў зьбіраліся некалькі разоў вялізарныя грамады работнікаў, дзеля з'арганізаваньня дэманстрацыйнага паходу. Усе спробы дэманстрацыі былі зьліквідаваны паліцыяй, пры чым даходзіла да боек. Лёгка ранена некалькі чалавек і 3 цяжка. Арышты сярод дэманстрантаў „досыць лічэбныя". Апрача гэтага, паліцыя не дапусьціла да з'арганізаваньня веча камуністычных паслоў Біттнэра і Росяка.

Па паўдні, як ў прафсаюз работнікаў, так і ў саюз прамыслоўцаў прышлі ад міністра працы Юркевіча запросіны на канфэрэнцыю ў Варшаве, вызначавую на 18 г. месяца.

17.X агульная сітуацыя забастоўкі ў Лодзі і Лодзкай акрузе не зьмянілася. У трамваях адбылося зграмаджэньне працаўнікоў, на якім пастаноўлена ня прыступаць да працы.

Па ўсім горадзе, па вуліцах кружаць лічэбныя патрулі пешай і коннай паліцыі.

На абшарах разьніцы ў Балюдах дашло да „авантуры": Гуртаўнікі самі рэзалі быдла. Забастоўшчыкі разагналі быдла, выпускаючы яго на вуліцы. Паміж работнікамі і гуртаўнікамі пачалася бойка, у якой ранены нажом старшыня гуртаўнікоў. Каб не паліцыя — бойка прыняла-бы шмат гразьнейшыя разьмеры.

Забастоўка мэталёўцаў.

У тым-жа дні адбылася канфэрэнцыя мэталёвых работнікаў з працадаўцамі ў справе работніцкага жаданьня 20 прац. падбаўкі. Жаданьне работнікаў прамыслоўцы катэгарычна адкінулі. Пасьля гэтага работнікі склікалі агульнае сабраньне, на якім пастаноўлена працягнуць пратэстацыйную забастоўку (абвешчаную дзеля салідарнасьці з валакнянікамі) аж да прызнаньня працадаўцамі іх варункаў.

Магістрат выдае незаможным бастуючым штодзенна па 5000 баханкаў хлеба і па 4,500 бясплатных абедаў. Аддзел грамадзкай апекі павялічыў у 2 разы на час забастоўкі лік бясплатных сьнеданьняў.

У сувязі з вмездам прадстаўнікоў прафсаюзаў на канфэрэнцыю ў Варшаву, кіраўнік прафсаюзу валакнянікаў заявіў, што прафсаюзы не падалі ніякой зьмене сваіх дамаганьняў і што ў далейшым працягу будуць падтрымліваць сваё першае становішча і дамагацца 20 прац. падбаўкі і выпаўненьня ўсіх тых пастулатаў, якія работнікі выставілі на першай канфэрэнцыі з прамыслоўцамі.

Нарады над ліквідацыяй забастоўкі ня далі рэзультату.

Цэлы дзень і аж да позняй ночы (12 г. 30 м.) 18 г. м. адбываліся ў міністэрстве працы ў Варшаве нарады над ліквідацыяй забастоўкі ў Лодзі. На нарадах былі, як прадстаўнікі работнікаў, так і прамыслоўцаў і прадстаўнікі ўлады—м-ва Працы.

Па некалькігадзінных нарадах асобна з кожнай стараной, міністэрства пачала а 7 гадзіне вечара агульныя нарады, якія працягнуліся аж да 12 г. і 30 м. ночы.

У перапынках мін. Юркевіч нараджаўся з прамыслоўцамі, прыхільваючыміся да некатарых работніцкіх пастулатаў, але нішто не памагло—работніцкія прадстаўнікі ня прынялі апошнія варункі прамыслоўцаў, прызнаючы іх за нявыстарчаючыя — ня задавольваючыя іх дамаганьняў і абвясьцілі, што астаюцца пры сваіх папярэдніх дамаганьнях, бяз зьменаў.

Навакол разгрому ў ППС.

У польскай прэсе ўсё часьцей зьяўляюцца інфармацыі аб „непаразуменьнях", „тарцях", а апошнімі днямі навет і аб развалу ППС. Разлом гэты ўжо быццам пачаўся ад часу выхаду „Przedświtu", органу даўнейшых сяброў ППС, якія цяпер увайшлі ў ўрад м. Пілсудскага, як мін. Марачэўскі і іншыя. Развал мае тую прычыну, што многім пэпээсам ужо абрыдзела насіць на твары нейкую маску апазіцыі да сучаснага ўраду Польшчы і яны стаяць за тое, што ўжо „пара" яе скінуць. Другая частка „сацыялістаў новага выпуску" стаіць на груньце, што скінуць маску яшчэ „не пара", бо буржуазія яшчэ не настолькі „ўстабілізавалася", каб магла выйсьці на адкрытую барацьбу з пралетарыятам.

Працэс камуністычнага пасла.

Ужо канчаецца сьледзтва выданага сёлета камуністычнага пасла Уладыслава Бачынскага. Працэс пачнецца ў сьнежні г. г. у Акружным Судзе ў Сасноўцы. Названы пасол абвінавачваецца ў антыдзяржаўнай дзейнасьці.

Цікавы працэс.

У Апэляцыйным Судзе ў Катавіцах распачаўся працэс, якім зацікаўлена, ня толькі ўся Польшча, але і заграніца. У працэсе расходзіцца аб абшары 30.000 гэктараў вартасьці 10 мільёнаў даляраў. Абвінавачваючым ёсьць былы прынц Фрыдрых Габсбург, абвінавачваным — Польская Дзяржава.

Акружны Суд у Цешыне выдаў прыгавор, якім адкінуў іск (позву) б. прынца, прызнаўшы яго толькі да некалькіх сот гэктараў, дакупленых у самым Цешыне, якія даходзяць толькі да 3 прац. усяго абшару, а 20 прац. вартасьці.

На гэты прыгавор, як пазоўшчык, так і Гэнэральная Пракуратура падалі заявы ў Апэляцыйны Суд. „Чыё цяпер возьме"—паглядзімо.

Заграніцай.

Нарада ў Парыжу ў справе адшкадаваньняў і міжсаюзьніцкіх даўгоў.

У Парыж прыехалі — англійскі міністар скарбу Чэрчыль і амэрыканскі „агент у справе адшкадаваньняў" (наглядчык за выкананьнем „пляну Доўса") Джыльбэр Паркер,— якія рабілі даўжэйшую нараду з Пуанкарэ— у справе складу і скліканьня „камісіі эксэртаў" (знаўцаў), якая — паводле апошняй жэнэўскай умовы між саюзьнікамі і немцамі—мае ўрэгуляваць справу адшкадаваньняў у зьвязку з справай міжсаюзьніцкіх даўгоў. Усё гэта зьвязана з канчальным скасаваньнем акупацыі, якога за ўсялякую цану дабіваюцца немцы. Як ведама, немцы згаджаюцца капіталізаваць свае адшкадаваўчыя даўгі, раскладзеныя на шмат гадоў, — сплаціць іх так ці інакш—вартасьцёвымі паперамі, на што, відаць, ахвотна згаджаюцца саюзьнікі.

Падрыхтаваньні ў справе скасаваньня акупацыі.

На акупацыйных абшарах Надрэніі пачаўся жывы рух сярод саюзьніцкіх уладаў. Паміж нямецкім мін. акупаваных абшараў і міжсаюзнай камісіяй кантролю распачаліся перагаворы ў справе пераезду камісіі з Кобленца ў Вісбадэн. Усё гэта прэса зьвязвае з хуткім выхадам саюзьніцкіх войскаў з „другога паса" акупацыі ў трэці,—апошні.

Ізноў рашучая заява вэнгерскага прэм.— у справе перагляду трактатаў і граніцаў.

На сабраньні ўрадавай партыі вэнгерскі прэм'ер гр. Бэтлен сказаў прамову, у якой яшчэ раз катэгарычна сцьвердзіў, што вэнгерскі ўрад, хаця не зрабіў дагэтуль ні воднага афіцыяльнага кроку ў напрамку перагляду міравога трактату, пакрыўдзіўшага нячувана Вэнгрыю, але ніколі і ня выракаўся думкі аб гэтым пераглядзе. Трэба толькі ведаць, што—справа гэта—ня справа якой аднэй вэнгерскай партыі, але — справа ўсяго вэнгерскага народу, і што—ня трэба думаць, быццам—„ад аднаго толькі гуку трубаў падуць самі сабой муры Ерыхона"... Для перагляду патрэбна, каб „справа гэта дасьпела". З свайго боку вэнгер. урад не зрабіў—у падпісаных ім новых трактатах—ані воднага кроку, які-б рабіў немагчымай справу перагляду існуючых граніцаў. Дык—„дзьверы астаюцца адчыненыя"... Паміж іншым, гр. Бэтлен заявіў, што ніколі Вэнгрыя не адмовіцца ад звароту ёй (аўстрыяцкага цяпер) Бургэнлянду... Гэта заява выклікала запрос у аўстрыяцкім парляманьце. Аўстрыяцкі прэм'ер у адказ на запрос—заявіў, што зараз-жа пасьля прамовы вэнгерскага прэм'ера запытаўся аб точным зьмесьце заявы адносна Бургэнлянду і атрымаў афіцыяльнае высьвятленьне з боку вэнгерскага ўраду: „заява зьмяшчае ведамы ўсім асабісты пагляд гр. Бэтлена на справу Бургэнлянду, дый зроблена яна на кангрэсе паліт. партыі".

Але-ж некалькі дзён таму вэнгерскі прэм'ер сказаў яшчэ вастрэйшую прамову проці несправядлівых трактатаў.

Сэнсацыйная чутка: Чычэрын—пасплом у Парыжу (?).

Быццам у маскоўскіх палітычных колах гутараць аб магчымасьці назначэньня Чычэрына паслом у Парыж на месца Доўгалеўскага. Радаваму ўраду вельмі залежыць на ўсталеньні добрых стасункаў з Францыяй, дык місію іх напрвы маюць даручыць гэтаму чаловаму дыплёмату СССР.

Орган нямецкіх манархістаў аб Польшчы.

Бэрлінскі карэспанд. „Кур. Варш." даносіць, што манархічная „Крыжовая Газэта" зьмясьціла 18 перадавіцай карэспандэнцыю з Варшавы, у якой у такіх фантастычных чорных фарбах прадстаўлена палажэньне ў Польшчы.

„У Польшчы, піша карэспандэнт, пануе хаос, які ня можна апісаць. Голад і ўбожства апанавалі насяленьне. Забастоўкі і галодныя бунты пашыраюцца з дня на дзень". Далей піша, быццам „радыкальныя колы ўкраінцаў — за маскоўскія грошы — паляць панскія двары, забіваюць польскіх урадоўцаў, паліцыянтаў, робяць напады на цягнікі, наагул, вядуць нячуваную рэвалюцыйную барацьбу"...

Праўду кажучы, аб усім гэтым неяк ня чуваць—дык і „нячуванае".

Але далей карэспандэнт кажа, што гэта—толькі яшчэ кветачкі, але ягадкі будуць пасьля...—пасьля таго, як Сойм адкіне дыктатарскі замах Пілсудскага на Канстытуцыю і калі Пілсудскі разгоніць Сойм, а сам абвесьціць сябе дыктатарам. Тады быццам маюць—„паўтарыцца падзеі маю 1926 г., толькі —яшчэ ў вастрэйшай форме". „У лістападзе Польшча мае быць абвешчана каралеўствам". „Праціўнікі сучаснага ўраду масава ўцякаюць ужо згары заграніцу — баючыся крывавай помсты з боку пілсудчыкаў". Лістапад мае быць апошнім — „страшным" судом для Польшчы, калі канчаткава вырашацца яе лёсы"...

Новая кітайская армія.

Радавая прэса дае цікаўныя весткі аб рэарганізацыі кітайскай арміі. Мірны склад арміі мае зьмяшчаць 700.000 жаўнераў. Армія будзе падзелена на акругі, корпусы і дывізіі. Апроч пяхоты, на сучасны ровень будуць пастаўлены—кавалерыя, артылерыя, атрады газавыя, паветраны флёт, танкі. Закон мае ўстанавіць 3-хлетні тэрмін абавязкавай ваеннай службы. Прэса цьвердзіць, што ген. Людэндорф, якому кітайскі ўрад запрапанаваў становішча галоўнага інспэктара кітайскай арміі, не адмовіцца ад прапазіцыі.

Сэнсацыйная вестка аб „рэвалюцыі" ў Афганістане.

Англійскія крыніцы даносяць, быццам у Афганістане выбухнула „рэвалюцыя". „Рэвалюцыя" мае характар „палацовы"—прыдворны; па іншых вестках—усенародны. Але зьмест яе лёгка адгадаць згары. „Рэвалюцыя" выклікана была раздмуханым мулламі (мусульманскімі ксяндзамі) „абурэньнем народу" проці тых навінаў, якія ўвёў гвалтам і раптам кароль Аман-Улах у краі. Дык вестка у канцы кажа, што галоўны мулла Афганістану з яго бліжэйшымі таварышамі—казьнены па загаду Аман-Улаха.

Лёнданскія газэты падаюць далейшыя весткі аб „рэвалюцыі", якая выбухнула ў Афганістане ў сувязі з рэформамі, уводжанымі гвалтам у краі Аман-Улахам. Пад упылывам агітацыі „муллаў" паўстаньне ахапіла адно з плямёнаў краю, проці якога кароль выслаў значныя атрады кавалерыі і артылерыі. „Карацельная экспэдыцыя", як цьвердзяць лёнданскія крыніцы, скончылася пасьпешна.

Забастоўка ў Гамбургскім порце.

Забастоўка ў Гамбургскім порце трывае ўжо 3 тыдні. У апошні час настроі бастуючых работнікаў завастрыліся, як цьвердзіць прэса, — дзякуючы агітацыі камуністаў, якія імкнуцца да агульнай забастоўкі. Частка работнікаў у іншых галінах працы прыступіла ўжо да падтрыманьня бастуючых.

Вялізарная сялянская дэманстрацыя ў Харватыі.

У месьце Сізак, у Харватыі, 21/X адбыўся кангрэс „сялянска-дэмакратычнай" партыі, у якім прымала ўчасьце — 40 тысячаў прадстаўнікоў апазіцыйнага сялянства. Кангрэс прайшоў у поўным спакоі і парадку. Старшыня партыі пасол Мацэк заявіў, што апазіцыя ня вернецца ў Сойм, пакуль не адбудуцца новыя выбары. „Тыя, што цяпер трымаюць уладу ў Белградзе, казаў ён далей, дарэмна спадзяюцца на сілу штыкоў, бо-ж запамінаюць толькі „драбніцу" — тое, што штыкі гэтыя знаходзяцца ў руках нашых братоў і сыноў — сялянаў. Праступнае забойства ў Скупшчыне (Сойме) скасавала Канстытуцыю ў Югаславіі.

Узнаўленьне нафтавых перагавораў паміж СССР, Англіяй і Амэрыкай.

Радавая гандлёвая прэса даносіць, што ў хуткім часе маюць узнавіцца перагаворы паміж радавым урадам і вялізарнымі нафтавымі трэстамі англійскім і амэрыканскім—ў справе ўзаемнага паразуменьня гэтых „нафтавых вялікіх дзяржаваў" сьвету. Як ведама, пачаўшыяся перагаворы былі нядаўна перарваны — з прычыны рашучай адмовы з

Маленькія, але разумныя.

(Апавяданьне дзядзькі Рыгора).

— Дзядзька Рыгор ідзе. Рыгор ідзе — радасна загаманілі хлапцы, якія сёньня і прышлі сюды да касьцёла, галоўнае, каб паслухаць „красвабая" дзядзьку Рыгора. За момант яны стабуніліся навакол яго і моўчкі чакалі, пытліва пазіраючы на дзядзьку. Той, прывітаўшыся, пачаў набіваць люльку і ціха штосьць гаманіў са сваім кумам з Гарохаўкі.

— Дзядзька, ты-ж абяцаў сёньня расказаць нешта пра пчолак! — ня выцярпеў і напомніў адзін з хлапцоў.

— Вось, якія гарачыя! Пачакайце крыху, дайце-ж хоць закурыць! — адказаў Рыгор. Запаліў люльку, пусьціў пару клубкоў дыму і прыпадняўшы галаву задумаўся — зьбіраў думкі. Слухачы прыціхлі, быццам хто, як кажуць, мак засеяў.

— Дык вось, людцы мае, — распачаў дзядзька Рыгор — атрымаў я гэту самую пазыку, аддаў пану, а пасьля ўзяў у галаву другое. Прасіў яе, думаю сабе, на пчалярства, а мяне-ж іх і заводу нямашака. Што, думаю, як прыедзе якая камісія праверыць— аштрафуюць! У іх гэта скора, абы прычэпку якую знайсьці да нашага брата.

Трэба, думаю, хоць адну калодку купіць — залатовак-жа 50 засталося ад гэтай пазыкі.

Туды, сюды і напытаў у Падліпках такі прыгожы вулік з пчолкамі. Закроіў ад мяне дзед Сымон 40 залатовак, таргаваліся, таргаваліся і на 35-ць прыбілі-такі мы з ім рукі.

Паехаў яшчэ да дня, прывёз і паставіў пад грушай на прыслонейку. Павыбягалі дзеці, ходзяць наўкол вульля, пазіраюць, любуюцца, а малодшы Яначка пачаў прасіць мяне:— Зрабі, тата, і мне гэтакі!

— Пачакай, кажу, сынок, як нараяцца пчолкі, тагды зробім і другі дамок для іх.

Вышла і Агата ўзглянуць, вясёлая такая. — Усё-ж, кажа, прыбытак у гаспадарцы.

Толькі ўжо, адыходзячы, пакруціла галавой дый кажа: — Ці патрапіш ты Рыгорка? Каля іх трэба, кажуць, знацца, а не — абкусаюць!

— Нічога, кажу ей, мне расказваў Сымон, як і што рабіць, а выбіраць мёд, або калі пачнуць раіцца, абяцаўся сам прыйсьці—трэба будзе, толькі паведаміць загадзьдзя.

За пару тыдняў заселянелі дрэўцы, распусьціліся веснавыя красачкі, настала ціхая, цёплая пагодка; ну, думаю, пара маім пчолкам на работу.

Перахрасьціўся, адчыніў лётку і—пачалі мае мушкі гудзець. Пашлі працаваць! Бывала, адпрагу каня на паўдзень, а сам забягу на мінютку зірнуць пад грушу. Снуюць пчолкі — адна з вульля, другая ў вуль, адна туды, другая адтуль—бязупынна, ды так рухліва, ані на хвілінку ня прысядзе пагрэцца на сонейку! Вось, думаю, хто шчыра працуе, навет і ў паўдні ня прыляжа адпачнуць.

Аж неяк праз месяц, віджу сядзіць на лётцы пчолка і грэецца.

Што-ж гэта, думаю, з ёй сталася — ніколі-ж гэтага ня бывала, можа, думаю хворая?

Прыглядзіўся, якое ліха хворая, зусім на гэтакую не выглядае! Сама вялікая, бруха таўстое, доўгая, ажна палыскуе на сонцы. Кратаецца, гудзіць.

Напэўна, думаю, гэта матка іхняя, прыпамінаю — так і ёсьць: дзед-жа і казаў, што яна шмат большая за работніцу. Ажна бачу яшчэ гэтакая выпаўзае з вульля, агледзіўся, што і па дашку дзьве гэтакія самыя поўзаюць — не, тут нешта другое! Але чаму-ж яны нічога ня робяць? Такая вялікая за трох мёду прынёрла-б.

А-а! — стукнула мне пасьля ў галаву, гэта-ж пэўне іхняя войска — сьцерагуць іх дамок.

Узяў палачку, думаю, паспрабую каторую патрывожыць, дый прызнацца і баюся. А што, як аступіцай абсядуць, ды пачнуць жаліць?

Агляяуўся—хата блізка, уцяку і дзьвер на клямку. Нарэшце адважыўся, порк, адну і ўжо нацэліўся ляцець, ажна віджу, як фырк! у вуль — уцякла, я тагды—другую і гэта тасама хаваецца. Якое-ж тут, думаю, войска, калі навет і не спрабуе бараніцца? Тут нешта, думаю, іначай, трэба будзе запытацца ў Сымона — сам тут, відаць, нічога ня ўцяміш. Прыпадняў дамок, глядзь у сярэдзіну — аж іх там, людцы мае, аж чорна! Поўзаюць, гудзяць, ядуць сабе гатовенькі мядок.

Спаткаў у сераду на кірмашы дзеда Сымона і расказваю яму пра гэтых таўстабрухіх.

— Што яны робяць? — пытаюся. Гэта, кажа, трутні, дармаеды іхнія, многа яны табе мёду, чалавеча, папсуюць. Трэба, кажа, з вясны ў чарках іх вытруціць, а цяпер не дасі з імі раданькі.

— Спусьціў я нос: — вось табе, думаю, і пакаштуй мядку — паядуць трутні.

— Нічога, кажа Сымон, мёду не папсуюць—пчолкі хутка з імі расправяцца! Прыслухайся, дык сам увідзіш!

Аж праўда! Неяк ужо пад восень, чую гудзяць мае мушкі і на работу ня йдуць. Што, думаю, з імі такое сталася?

Прыпадняў крыху вечка і гляджу ціханька ў вуль адным вокам. Аж там, людцы мае, настаяшчы бунт, нераўнуючы, рэвалюцыя якая! Трутні сьціснуліся ў адзін куток, а пчолкі па ўсім вульлю разыдуюць, шумяць на іх:— Дзн, дзн! Прэч дармаедаў! Досьць вам карыстацца нашай працай! Пакрасаваліся і так праз лета, гультаі!

— Гэта-ж не мажлівая рэч—развадзіла адна паўперадзі — разьвялося іх тут цэлая хмара, а зьесьць кожны за нас пяцёх. Калі іх ня зьніштожым, дык і самі памром з голаду, сястрыцы. Зьядуць увесь мёд гэтыя таўстабрухія! Вон іх з вульля! Прэч дармаедаў!

Трутні маўчаць, трасуцца толькі са страху, ды шэпчуцца нэрвова паміж сабой. Нарэшце, віджу прыпадняўся адзін на заднія лапы і гавора да работніцаў:

— Джн-гу! Калі нас загубіце, дык і самі тагды згінеце! Ніякага парадку бяз нас ня будзе. Хто-ж тагды будзе вамі распараджацца, хто вас разбудзіць на работу, хто будзе вамі камандаваць, калі на гэты дамок нападзе які вораг? Падумайце, якую глупасьць хочаце зрабіць! Бяз нас марна згінеце, самі потым шкадаваць будзеце.

Адумайцеся, ды лепей забіце гэтых бунтаўнікоў, якія намаўляюць вас на гэту глупую справу!

Мы-ж тут ад веку... дзяды, прадзеды..

— Дзв! Джн!—узьняліся пчолкі — Далоў! Брэша гіцаль! Досьць наслухаліся дасюль вашых басьняў! Яны на работу будзяць, лежабокі! Сьпяць да самага паўдня, гультаі! Каб мы чакалі на вашу пабудку, дык даўно ня жылі-б на сьвеце! Камандзіры гэтакія! Білацяя гудзець, седзячы здалёк ад ворага, а вы папрабуйце самі на яго кінуцца, жыцьцё сваё аддаць у барацьбе. Трусы, подлыя! Хваляцца яшчэ! Патрапім бяз вас—

боку радавага ўраду—адлічаць пэўны працэнт з прадаванай заграніцу нафты, на карысьць былых уласьнікаў нафтавых абшараў, якія былі канфіскаваны радавым урадам і нацыяналізаваны.

Радавая прэса падчырківае, што пачын узнаўленьня перагавораў ідзе з боку Англіі і Амэрыкі.

Канфлікт між СССР і Латвіяй.

Умацаваўшыся ў выніку новых выбараў права-цэнтровы ўрад Латвіі зрабіў „крок няпрыхільнасьці“ ў стасунку да радавага ўраду. Ен не запрасіў радавага ваеннага агента ў Рызе Судакова на васеньнія манэўры латвійскай арміі. Гэты крок выклікаў вялікае абурэньне ў Маскве.

На такі „вызаў“ радавы ўрад, як даносяць з Масквы, адказаў, шпарка і рашуча: ён зараз-жа адклікаў свайго ваеннага агента з Рыгі і запрапанаваў латвійскаму ўраду—безадкладна зрабіць тое-ж самае з сваім ваенным агентам у Маскве.

Як зьліквідуецца небясьпечны канфлікт, няведама.

Справакаваны рознымі „дарадцамі“ канфлікт латвійскага ўраду з Радамі прадаўжаецца. З Рыгі выехаў у Коўну радавы ваенны агент Судакоў, які адначасна спаўняе тыя-ж абавязкі пры літоўскім і эстонскім урадах. Адначасна ваенны прадстаўнік латвійскага ўраду пакінуў Маскву, каб больш не варочацца туды.

Літоўска-латвійскі канфлікт.

Паміж Вальдэмарасам і латвійскім мін. загран. спраў Балодысам узгарэўся канфлікт, які, здаецца, мае каштаваць латвійскаму міністру яго становішча. Балодыс, як заявіў у сваім вельмі рэзкім „інтэрвью“ (гутарцы з журналістам) вёў проці Літвы на апошнім зьезьдзе дыплёматаў у Жэнэве вельмі варожую кампанію (ў зьвязку з узнаўленьнем руху па лініі Лібава-Ромны), што—„ня можа прычыніцца да ўтрываленьня традыцыйных добра суседзкіх адносінаў паміж абодвума брацкімі народамі“.

Балодыс адказаў таксама нясуадказным „выгаварам“ прэм'еру прыязнай дзяржавы, закідаючы яму „нязгодныя з дыплёматычнымі звычаямі выражэньні“. Вальдэмарас адказаў на гэта, што пасьля гэтага „прадстаўнік латвійскага ўраду ня можа быць „пэрсона грата“ (спэцыяльна паважанай асобай) ў Коўні“, Канфлікт мог зьліквідавацца толькі—выходам або Вальдэмараса або Балодыса...

Гаспадарчая вайна паміж Літвой і Эстоніяй.

Паміж балтыйскімі дзяржаўкамі, яшчэ нядаўна так імкнуўш. амаль што не да аб'яднаньня, прынамсь гаспадарчага, што далей то больш пачынаецца палітычны і гаспадарчы „разнабой“. Значную ролю ў гэтым, трэба думаць, адыгрывае польска-літоўскі канфлікт і самазабіўчая гаспадарчая палітыка Вальдэмараса.

Пасьля дыплёматычнага канфлікту з Латвіяй выбухнуў гаспадарчы канфлікт Літвы з Эстоніяй. І кастрычніка меў распачацца стан „эканамічнай вайны“ паміж гэтымі абодвума краямі.—Бо—літоўскі ўрад—пасьля доўгіх перагавораў у справе з Эстоніі „мытнай уніі“ раптам ўвёў у сябе такія высокія мыта на эстонскія тавары, што зрабіў немагчымым усялякі ўвоз з Эстоніі ў Літву. Эстонія адказала таксама „мытнай рэпрэсіяй“, і „вайна“ ўзгарэлася.

Чуткі аб падрыхтаваньні... вэнгерскай манархіі.

Мусоліні працуе ўсьцяж лад „адбудовай“ манархічнага ладу на ўсім абшары „ўплываў Італіі“. Толькі што адбудавана — дзякуючы яго дапамозе—манархія ў Альбаніі, цяпер на чаргу дня пастаўлена справа караля ў Вэнгрыі.

Нямецкае агенства паведаміла аб тым, быццам у Вэнгрыі ідуць сэкрэтныя падрыхтаваньні — ў справе паваролу на вэнгерскі трон былога каралёўскага дому. Быццам, ужо ў пачатку лістапада мае быць абвешчаны каралём прынц Альбрэхт Габсбургскі. Як ведама, Францыя заявіла нядаўна, што не дапусьціць паваролу Габсбургаў на вэнгерскі трон. Здаецца, такую-ж перасьцярогу зрабіла афіцыяльна і Англія. Але гэта не перашкаджае Італіі падтрымліваць гэтую акцыю вэнгерскіх абшарнікаў. Асабліва цяпер—калі Італія рашуча парвала з Англіяй і Францыяй і вядзе сваю ўласную палітыку — без паразуменьня з саюзьнікамі.

Вэнгерскае агенства рашуча запярэчвае весткам нямецкага.

Напад на цягнік з кандыдатам Смітсам.

Амэрыканскія газэты поўныя падробнасьцямі аб сэнсацыйным нападзе бандытаў на цягнік, у якім ехаў кандыдат „дэмакратычнай партыі“ Смітс,—адбываючы сваю агітацыйную падарожжу па краю. Відаць з гэтага, што „выбарная кампанія“ ў вясёлай Амэрыцы—што называецца — у поўным разгары...

Уладзімір Астроўскі.

Байка.

Дзесьці, каля ракі Дзьвіны, дзе жывуць паны, жыў сабе бедны селянін-земляроб.

Жыў, цяжка працаваў, усе сілы на працу пакладаў, потам сваю ніўку паліваў,—а бедаваў, бедаваў і бедаваў...

Злыдні, як тыя мышы, у-ва ўсе шчэлкі яго старэнькай халупы залязалі. На саломе спаў. Старым кажушком накрываўся, пад галаву на-нач сумныя думкі падкладаў,—думкі пра заўтрашні горкі дзень, пра сыноў, для якіх зямлі не хапае ды якія выйдуць з хаты ў сьвет на голад і паняверку.

Што будуць яны ў сьвеце рабіць? Дзе знойдуць сабе скарынку штодзеннага хлеба? Можа стануць гаротнымі паціхачамі ў чужынцаў. Можа зьгінуць з голаду пад чужым парканам? Можа выедуць за далёкае мора, каб там стаць белымі нявольнікамі, якімі калісьці былі іх дзяды на Бацькаўшчыне? А можа ў цёмную матку-ночку з голаду возьмуць дубіну ды гайда на шырокую дарогу, а потым згніюць у вастрогах?

Трудна бацьку так варажыць пра сваіх сыноў.

Але-ж мусяць яны кудысьці пайсьці, бо зямлі як няма, так і няма; зямля ня чума, яе не „разьвядзеш“.

Каб ім даць грошы, эт так „на шчасьце“, можа з грашмі і знашлі-б сабе шматок хлеба!

— Грошай даць? Ха-ха-ха! — горка засьмяяўся, аж сьцены здрыгнуліся.

Палючы, страшны сьмех бедняка-беларуса.

Грошай? А скуль?

Калі розныя павукі перагрызьлі яго кішэні. Ледзь запрацуеш дзе-што, пакладзеш да кішэні, як яны цераз дзюркі і выцеклі. Ізноў запрацуеш, ды ізноў выцякаюць. Так проста ў ляпу вось гэтых павукоў, п'явак ды розных галавасьцікаў. А якія тоўсьценькія ды гладзенькія яны! Якія камянічкі яны маюць! Сколькі нашых грошай у іх!

Цяжка задумаўся небарака-земляроб.

І чуе:

Нешта шэпча яму родная ральля: „Гною дай, а я стану радзіць залатое жытца ды пшанічку на піражкі, ды такія пухлявыя, ружовыя ды белыя, як тварык беларускай дзяўчыны“!

Шэпча яму занядбаны садок: „Дагледзі мяне, а я прагадую цябе і дзетак тваіх“!

Мычыць жалабна кароўка са ўпалымі бакамі: „Пашы, сытнай, пашы дай! А я дам табе шмат-шмат малака, а такога густога, як сьмятана“!

Гудзяць над яго вухам пчолы: „Дагледзі нас, вуліка нам новага дай, а мы табе так засалодзім жыцьцё, як толькі можа засаладзіць яго маладая пешчатлівая кабетка, твая Альжбетка“.

Усе просяць: „Дай, дай“!

Так зараз гэтыя грошы і возьмеш, калі лезуць яны вун цераз дзіравыя кішэні ў ляпу тых павукоў ды п'явак?!

— Хі-хі! — піскнуў дзесьці павук, — я дам табе грошай, толькі ты дазволь высасаць з цябе вось так працэнтаў са сто ў год!

Схапіўся наш небарака змучанымі рукамі за галаву. Зьвесіў яе, як зьвешвае галінкі плакучая бяроза. А з вачэй яго цураць кроплі за кроплямі і гарачынёй сваей аж зямлю перапальваюць.

— Хто, хто паможа мне?! Хто ратуе ад гэтых павукоў ды п'явак? Хто абароніць мяне ад голаду, нявольніцтва, ды страшнай спакусы?

. . . .

Раптам чуе нямы голас:

— Я!

Падняў вочы. Хіснуўся назад. Яскравы бліск асьляпіў яго.

Перад ім — сонечная Байка. Вочы — як зоркі на небе. Тварык — як краска лясная. Вусны так чысты і сьвяты, што хоць маліся ім.

Грудзі дыхаюць сонечнай цяплынёй, любоўю і спачуцьцём.

— Я памагу табе!—шэпчуць яе вусны шопатам нашых вясновых узгоркаў,—я ўсё зраблю для цябе, толькі павер мне, толькі ўпусьці мяне ў сваю хату, толькі слухайся мяне! Не абяцанкі-цацанкі сулю табе, не баламуціць цябе зьбіраюся, а памагчы ў тваей нядолі і горы!

Шэпча байка далей свае салодкія, чароўныя словы:

— Я пражану ўсіх тых павукоў ды п'явак. Я зачарую тваю кішэню і ня адзін грош ня выцячэ праз дзюркі твайго кішаня. Я збудую табе новую хату і ў ёй ствару зямны рай: прынясу часопісаў, кніжак, музычных струмэнтаў, радыё. Я дам табе карысную пазычку на гаспадарку. Я дам табе штучныя ўгнаеньні, машыны, прылады. Я прадам выгадна твой хлеб і ўсе твае гаспадарскія прадукты. Я закладу для цябе ўласныя крамкі, фабрыкі, дзе ты сам будзеш купляць, прадаваць і перарабляць прадукты твайго мазаля. Я пабудую для тваіх дзетак родныя школы, народныя дамы, бібліятэкі, спартовыя салі, тэатры і шпіталі. Я выбрукую твае балотныя вуліцы. Я дам тваім беззямельным і малазямельным сынам добра аплачаную работу ў тваіх уласных родных прадпрыемствах. А калі табе прыемна будзе езьдзіць, дам табе веласіпэды, аўтамабільчыкі...

Байка ўкленчыла перад бедным беларускім земляробам і, абыймаючы яго калені, благаюча шаптала:

Я ўсё, усё зраблю для цябе. Для сябе-ж я нічога не жадаю. Аднаго толькі вымагаю:—пакахай мяне, ідзі хутчэй за мной. Я дам табе шчасьце, якое ніколі ня сьнілася ні тваім бацькам, ні табе беднаму.

Задумаўся земляроб. Прывык да баламутных абяцанак, а тут—няўжо шчырасьць?

— Перастань быць упартым, — маліла байка,—павер мне—і станецца дзіва. Я вызвалю цябе з нявольніцтва.

— Веру,—нарэшце сказаў земляроб, — веру, бо мушу верыць, што ня можа так вечна быць, што „засьвеціць сонца і ў нашае ваконца“. Але скажы мне, мая добрая байка, як імя тваё, каб я ведаў, да каго зьвяртацца мне?

Нябескі ўсьмешак пакрыў вусны байкі і, падаючы сваю цудадзейную руку, сказала:

— Маё імя — Каапэрацыя.

Вольны перакл. з украінскага П.

хай толькі хто зачэпіць! Гнаць іх вон гэтых самахвалаў!! Сьмерць махлярам, абжорам гэтым!! Далоў! Прэч з вульля!!—гудзелі ўзбураныя пчолкі і ажна хваляваліся, вось, вось гатовыя рынуцца на трутняў.

Бачу, яны ажна пагорбіліся са страху—чуюць, што хутка ім будзе халэймус, але, як кажуць, утопленьнік і за саломінку хапаецца. Так і яны, людцы мае, пачалі страшыць пчолкаў:—Бзз! Гу-у!—груба загудзелі злыдні.—Думаеце, так лёгка з намі справіцца? Папрабуйце толькі! Адзін вас дзесяцёх абдужае! У парашок сатром, бунтаўшчыкоў!

Узьняліся, ды як сунуцца, людцы мае, на пярэдніх пчолак, якія найбольш уядаліся на іх!

Пачалі ціскаць, душыць.

Напалохаўся я тут, думаю, перагубяць працаўнічкоў маіх.

Ажна не далі і яны прамаху—схамянуліся. Так і закіпелі ад злосьці і абіды.

— Што, гудзяць, мардаваць нас будзеце?! Не папусьцім сваіх у абіду, сястрыцы! Душы іх дармаедаў!! Біць іх!

— Ня трэба сястрыцы біць—зазьвенела, нераўнуючы як той аратар, узьляцеўшы высока на рамку адна пчолка—самі яны падохнуць! Адарваць ім крыльля, каб не маглі падняцца дый вікідвай вон з вульля! Толькі ўсе зараз—дружна! Джз! Дзз!—раз, два! падала яна каманду і сама першая як фыркне на трутняў, а за ён і ўсе як сунуцца! Людцы мае, што там дзеелася! Гэны мяшкі прабавалі сьпярша бараніцца, дык дзе-ж там! Як абселі, ажна чорна каля кожнага—ўвіхаюцца! Толькі трэск ідзе, як яны ірвуць трутням крыльля.

Бачаць брухачы — кепская справа, ціснуцца па кутках, у шчалінкі, але куды дзенешся—цягнуць да лёткі і пхаюць вон з хаты. Гудзяць трутні—просяцца, мусіць, але нічога гэта не памагае. Чую толькі каля майго вуха нехта—джы!—разгледзіўся, ажна ціснецца адзін тоўсты ў гэту шчалінку, што я гляджу, а за ім цэлы рой пчолак гоніцца.

Напераліўкі тут мне, людцы мае, думаю, як жыгне каторая ў вока—асьлепнешь.

Зачыніў вечка, ды сам — ходу і стаю здалёку—прыглядаюся. Бачу трутняў аднаго за другім выкідваюць з лёткі на зямлю, а яны поўзаюць, паглядаюць на вулік.

— Напрасна, думаю, ня лучыш больш туды—капут вам абжоры!

Прышоў да хаты, расказваю гэта Агаце і думаю сам з сабой: — Вазьмі ты іх! Такія маленькія жывёлкі-мушкі, а якія разумныя, дружныя, а мы...

— На гэты раз ты, дзядзька, змахляваў крыху!—зацеміў адзін з прысутных. Як-жа гэта можна зразумець, што гавораць пчолкі?

— Эх-хэ-хэ!—цяжка ўздыхнуў Рыгор.—Зразумееце і вы, дзеткі, як больш пажывеце, ды пагаруеце на сьвеце.

Замоўк дзядзька Рыгор, пачаў набіваць сваю люльку нейкай махоркай, а тым часам сярод слухачоў узьнялася дыскусія, ды чуць ня сварка з прычыны яго байкі.

— Лоўка размаляваў!

— Салгаў на гэты раз.

— Салгаў! Ты сам салгаў — дзядзька байку толькі збаяў.

— Байку, але байка заўсёды выходзіць на праўду, трэба толькі зразумець яе, браткі—адклікнуўся, стаяўшы паводаль худашчавы малец.

Рыгор з цікавасьцяй глянуў на яго, засьмяяўся ціханька сабе пад вус відавочна неяк павесялеў і задыміў са сваей люлькі.

П. Асака.

Наша хроніка.

Канфіската. **По загаду Старосты Гродзкага на м. Вільню сканфіскаваны папярэдні 7-мы нумар газ. „Слова Працы“, за зьмяшчэньне наступных артыкулаў — перадавіцы „Полярызацыя сілаў“. „Дзесяць гадоў“, „Пад клясавым штандарам“ і інш.**

Закончаньне працэсу 35 грамадаўцаў. На другі дзень працэсу проці 35 быццам сяброў камуністычнай партыі Зах. Беларусі суд выслухаў сьведак, як з боку пракуратуры, так і з боку абароны. Сьведкі пракуратуры гавораць, што падсудныя выявілі найактыўнейшую дзейнасьць толькі ў 1926 годзе, калі распачалі акцыю ў кірунку выкліканьня паўстаньня, абяцаючы помач суседняй дзяржаве. На цэлых абшарах Маладэчанскага, Ашмянскага і Сьвянцянскага паветаў, пачалі ўвіхацца агітатары, склікаўшыя сабраньні, на якіх гаварылі падбурваючыя прамовы і зьбіралі складкі на карысьць вязьняў—„камуністаў“. Названыя паветы складалі район, на чале якога стаяў нейкі Зіновіч, а па ўцечцы яго ў СССР гэтую функцыю выпаўняў абвінавачаны Семашкевіч. 14 жніўня адбыўся ў Лебедзеве зьезд, на якім быццам быў прадстаўнік ад ЦК КПЗБ, і пастаноўлена ўступаць у легальныя тады партыі, як НПХ і „Грамаду“.

Далей прыступлена да разгляду „dowodów rzeczowych“, як сьцягаў, карэспандэнцыі, квітоў, літэратуры і г. д.

На трэці дзень працэсу быў прачытаны прыгавор суда, якім 13 чалавек апраўдана, 12 засуджана на кары, якія ўраўнаважыліся амністыяй і дасудовым вастрогам, рэшта 10 засуджана ад 2 да 4 год, цяжкага вастрогу. Адзін з іх—Роўны — засуджаны на год крэпасьці.

Засуджаныя на цяжкую турму прынялі прыгавор спакойна.

Цікавы выпадак з былым паслом Валошынам. Ня так даўно адміністрацыя турмы ў Равічы, дзе знаходзіцца былы пасол Валошын, абвесьціла яму, што ён звольнены з турмы. Калі зьдзіўлены Валошын запытаўся: „на якой падставе“. Дык яму адказалі: „не разважаць і хутчэй апранацца“.

У канцэлярыі турмы яму перадалі дакумэнты аб звальненьні. Лічучы тое, што рабілася, за галюцынацыю, Валошын яшчэ запытаўся: „А як-жа з маімі сябрамі, ці яны таксама будуць звольнены“? Яму таксама і тут адказалі: „не разважаць“. Не разумеючы да канца, у чым справа і не жадаючы папасьці ў нейкую пастку, Валошын заявіў, што ён бяз сваіх сяброў з турмы ня выйдзе. Адміністрацыя мусіла званіць у Вільню і даведацца, у чым справа. Пасьля высьненьняў Валошын астаўся ў турме. Як перадаюць, выясьнілася, што за паслом Валошынам, апрача агульнае справы, лічыцца шмат і драбнейшых справаў. Як відна, за адну з гэтых спраў Валошын адбыў кару і суд, відаць, забыўшыся, што справа ідзе аб пасьле Валошыне, чуць ня звольніў яго.

Адным словам чуць ня сталася сэнсацыя.

Вынікі неадбытага зьезду Т-ва Белар. Школы. Як нам перадаюць, у зьвязку з зьездамі Акружных Упраў Т-ва Белар. Школы на мясцох пачаліся знаёмыя нам „баданьні“ і „затрыманьні“ пасобных працаўнікоў Т-ва.

У Горадні падроблены такім баданьнем усе дэлегаты на агульны зьезд, а ў памяшчэньні Управы зроблена рэвізія і забраны пратаколы паседжаньняў Управы і Акружнога Зьезду, а таксама і іншыя справы. Дэлегатаў прадзяржалі па цэлым дню і адпусьцілі, папярэдзіўшы, што „ня зусім“.

Ці не перакінулася праца нашай санацыі і на правінцыю.

Літоўская прэса аб канфіскатах беларускай радыкальнай прэсы. 19 нумар выходзячага ў Вільні літоўскага 2-хтыднёвіка „Жыцьцё Народу“ зьмяшчае заметку, што „ўжо ўсе прывыклі да сыстэматычнага канфіскаваньня органу беларускіх радыкалаў, які ўжо зьмяніў столькі назоваў, што запраўды ня ведама, які яго чародны назоў. Аднак, „Гродзкае Староства“ не пазваляе жартаваць і „Маланцы“, якая таксама дачакалася часьцейшых канфіскатаў. Каб беларусам ня было крыўды, сканфіскавана на пацеху па кароткай „перадышцы“ „Vilniaus Aidas“. Падаючы гэтую ведамасьць, пашкадаваная рэдакцыя толькі дадумываецца, за што была канфіската“.

У справе працэсу „Грамады“. Нам перадаюць, што, апрача адвакатаў, апэляцыю на прыгавар Акружнага Суда ў Вільні злажылі і самі засуджаныя.

Календар на 1929 г. Ужо заканчваецца друкаваньне і праз 2 тыдні выйдзе ў сьвет кніжка — Календар Выдавецкага Т-ва на 1929 г. Фармат кніжкі ў два разы вялікшы, чым у мінулым годзе (11 аркуш.). Кніжка будзе каштаваць прыблізна 1 зл. 50 гр., мо' навет трохі даражэй, зьмест вельмі багаты, складаецца з 12 аддзелаў. У календары зьмешчаны цэлы рад фатаграфій паватовых з'ездаў Т-ва Бел. Шк., народных дамоў, драмат. і музыкал. кружкоў, бібліятэк-чытален і т. д.

У справе заказаў зварочвацца па адрасу: „Wilno, ul. Ostrobramska № 1, księgarnia białoruska Wydawn. T-wa“.

„Сон Гаўрылы“. Надовячы вышаў з друку маленькі зборнік вершаў Улад. Ініцкага, пад загалоўкам „Сон Гаўрылы“.

Ня гледзячы на некатарыя (тэхнічныя) заганы, зборнічак наагул досьць цікавы, толькі незразумела пасьвячэньне аўтара:

„Вам, браты мае, сястрыцы
І ўсей шляхце, як з Ініцы,
Так з ваколіцаў Міра
І ўсім тым, каго зямля
Беларускае трымае —
Кніжку гэту пасьвячае“
Аўтар.

„Зарніца“ пакрысе скідае маску. Няма места (і сэнсу) разглядаць хоць больш-менш падрабязна беларускую згодніцкую прэсу, бо яе і так ведаюць беларускія працоўныя гушчы. Але нельга прапусьціць некатарых запраўды гумарыстычна выходзячых „вочак“ гэтай прэсы. Так у № 3 „Белар. Зарніца“ ў артыкуле: „Рукі прэч“, між іншым, піша: „Беларускія царкоўна-грамадзкія дзеячы (з пад „Зарніцы“—Рэд.) імкнуцца да збліжэньня духавенства з народам (бяссумліўна спадаровым! — Рэд.) дзеля ўзмацаваньня і палыбленьня праз роднае веры (?!) дабра царквы, народу (спадаровага і „ижэ с ним“—Рэд.) і самога духавенства“...

„Беларуская Зарніца“ мае на мэце ўзмацаваньне роднае веры (ў залатога бога“—Рэд.) ад уціску яе праз каго-бы то ні было (пэўна белар. рад. прэсы, дэмаскуючае яе ў вачох беларускіх працоўных гушчаў!—Рэд.), абчышчэньне яе ад чужацкіх (?!) элемэнтаў (пэўна „пыврото вых“) і г. д. і ўсім тым, хто будзе шкодзіць у гэтай „працы“ (!) кажа: „рукі прэч“!

У другім артыкуле („Агляд прэсы“) „Зарніца“ вельмі расхвальвае „Спадара“ за яго перадавіцу ў „Народзе“, „Новая пара ў бе-

ларускім руху", дзе Спадар расхвальвае Каўша.

Праўда, што новая пара (гнядых!) запражаных у крамку-воз (зьвяз). Але нешта іх воз йдзе „колькі ўбіў, толькі ўехаў" і то ня ўперад, а ўзад.

Забастоўка беластоцкіх валакняньнікаў. 17 гэтага кастрычніка ў Беластоку адбылося сабраньне работніцкіх дэлегатаў усіх валакняных фабрыкаў. Па абгаварэньні закліку (wezwania) галоўнага ўраду прафсаюзу работнікаў валакнянага промыслу, пастаноўлена прыступіць да агульнай забастоўкі работнікаў валакнянага промыслу ў Беластоку, дзеля падтрыманьня лодзкай забастоўкі. Адначасна пастаноўлена дамагацца той-жа падбаўкі, што і лодзкія работнікі.

Забастоўка ў віленскай фабрыцы кансэрваў „Балтык". 17 гэтага кастрычніка ў віленскай фабрыцы кансэрваў „Балтык" выбухла забастоўка работнікаў. Адразу забаставалі ўсе 110 работніц.

Прычына забастоўкі наступная: Працуючыя там работніцы не належалі аж да апошняга часу ні да якога прафсаюзу. Цяпержа, „пад уплывам агітацыі", як кажа буржуазная прэса, значная частка работніц захацела запісацца ў прафсаюз. Гэтаму запярэчыла дырэкцыя, што выклікала вострае выступленьне пэўнай часткі работніц, на што дырэкцыя адказала звальненьнем 4 „найбольш неспакойных" прыхільнікаў прафсаюзу. Работніцы запратэставалі проці такой зьверскай самаволі працадаўцы і зажадалі прыняцьця выдаленых работніц. Дырэкцыя гэтыя жаданьні адкінула, што і выклікала забастоўку.

У наступным дні забастоўка ў фабрыцы „Балтык" завастрылася. Дырэкцыя не зьмяніла сваей пастановы адносна звольненых работніц, што выклікала забастоўку і рэшты работнікаў, не далучыўшыхся да яе адразу.

На трэці дзень забастоўка яшчэ пашырылася: забаставалі і бюровыя (канцэлярскія) працаўнікі. Бастуючыя выясьнілі свае жаданьні і пастанавілі станоўча дамагацца: рэгуляцыі платы, аддзельнага вынагароджаньня за надлічбовыя гадзіны працы і згарманізаваньня з прафсаюзам усялякіх пэрсанальных зьменаў у фабрыцы.

Да апошняга часу, абодва бакі яшчэ не наладзілі ніякіх перагавораў паміж сабой.

Вельмі цікава, што падаючы вестку аб першым дні гэтай забастоўкі абшарніцкае „Słowa" ў № 240 падае наступныя камэнтары:

„Ясна, што самы факт забастоўкі выкарыстаюць цяпер камуністы, дзеля згітацыі за права належаньня работнікаў да прафэсіянальных саюзаў".

Катастрофа швайцарскага самалёту пад Вільняй. У мінулым тыдні недалёка ад Вільні з прычыны папсуцьця матору спусьціўся швайцарскі самалёт. У часе спусканьня ў самалёце паламаліся ніжэйшыя часткі, лётнікі вышлі няўшкоджанымі. Швайцарцы ляцелі з мэтай зьведаць — Крулевец, Коўню і Маскву.

Павялічэньне паліцыі. Дзяржаўды Урад Пасярэдніцтва Працы ў Вільні мае ў сваей эвідэнцыі запатрэбаваньне на „większą ilość" (на большы лік) кандыдатаў на настарункових Дзяржаўнай Паліцыі.

„Безработныя, рэфлектуючыя на гэта, павінны зьвярнуцца да гэтага ўраду".

Як бачым, дык яшчэ паліцыі „мала" на „Крэсах".

Дзіўны ўрадовец. Сэквэстратар Скарбовага Ураду ў Наваградку Альбэрт Олінскі, відаць, моцна любіць „сьвянцовую", што пад яе ўплывам бачыў сябе на „Крэсах" і „царом і богам"—бо раз так нацягнуўся, што навет абразіў свой урад і навет асобу марш. Пілсудзкага. За гэта паліцыя падала яго ў суд, а Навагрэдзкае „Староства Грэдзкае" распачала з ім справу за п'янства і за парушэньне парадку.

Прыгавар у справе былога старшыні „Strzelca". У Баранавіцкім Судзе адбылася справа былога старшыні „Strzelca", цяпер начальніка мяйсцовай тэлеграфічнай установы Тапальніцкага, абвінавачванага ў „дэфраўдацыі" 6.000 злотых. Тапальніцкі прыгавораны на 2 гады турмы з залічэньнем дасудовага арышту і пазбаўлены эмэрытуры.

Падслухоўваючая станцыя. Варшаўск. прэса („Rzeczpospolita" № 299) падае, што ў раёне Івянца польскія пагранічнікі выкрылі на польскім абшары радавую падслухоўв. станцыю, якую, натуральна, зьнішчылі.

Арышт тэрарыстаў. Пэўнага часу ў м. Фабрычныя Доліцы, у адну з пякарняў, ня ведама кім, была ўкінута ручная граната. Першапачатковае сьледзтва ня дала ніякага рэзультату. Прэса інфармуе, што ў гэтай справе арыштаваны жыхар Беластоку—Казімер Цялінскі, які быццам прызнаўся да віны і назваў супольніка Рышарда Візэ, ужо таксама арыштаванага.

Небясьпека ваўкоў. У кустох на шляху Лебедзева-Маладэчна знойдзены труп маладога мужчыны, вельмі абгрызенага ваўкамі.

Сьледзтва ўстаяліла, што ахвярай ваўкоў стаўся Янка Садоўскі, жыхар вёскі Паддулішкі, які ноччу з 10 на 11 кастрычніка выйшаў з дому ў Маладэчна і больш не вярнуўся.

Няма супакою беларускаму селяніну ад ваўкоў усіх гатункаў, будзь гэта на 2 ці 4 нагі.

З Т-ва Бел. Школы.

Дня 14. X. 28 года адбыўся Акружны Сход Т-ва Беларускае Школы Горадзенскага павету, дзеля выбару 2-х дэлегатаў на агульны Зьезд Т-ва ў Вільні.

Зьезд адчыніў старшыня Акр. Управы, запрапанаваўшы выбраць старшыню і сакратара сходу.

Даклад аб значэньні данага сходу і аб завяшэньні Галоўнае Управы зрабіў старшыня Акружн. Управы.

Пасьля дакладу сяброў-дэлегатаў, высьветлілася, што ўсе гурткі Т-ва з балючым сумам спаткалі вестку аб завяшэньні Галоўнае Управы, як адзінага цэнтру культурна-асьветнага жыцьця працоўных беларускіх мас, места і вёскі.

Далей высьвятлілася, што праводзяцца перашкоды да працы гурткоў.

Яшчэ ад выбараў у Сойм у Горадз. павеце не дазволена паставіць ні аднаго спэктаклю, ні зрабіць ні аднаго сходу паасобных гурткоў Т-ва. Забароны нічым не матываваны. Перашкоды яшчэ павялічыліся з завяшэньнем Галоўнае Управы. Масу нэрвуе брак вестак ад вышэйшых органаў аб далейшым існаваньні Т-ва Бел. Школы.

Але відаць было з настрою ўсіх сяброў-дэлегатаў, што яны ёсьць шчырымі прадстаўнікамі ад цёмнага працоўнага беларускага люду, які жадае працаваць над пашырэньнем сваей культуры.

Яны ня падаюць духам перад гэтымі, ня першы раз ужо спрабаванымі намі адносінамі да беларускай культурна-асьветнай справы, а сьмела і цьвёрда выявілі свае жаданьне змагацца з цемраю, змагацца з усімі перашкодамі, якія робяцца Т-ву Бел. Школы пры помачы здраднікаў, некаторых былых грамадоўцаў.

Далей ад імя Акружное Управы запрапанавана было Агульнаму сходу выказаць глыбокі жаль па поваду завешаньня Галоўнае Управы Т. Б. Ш. у Вільні.

Рэзалюцыя была цалком прынята аднагалосна пры адным устрымаўшымся.

Пасьля 10-ці мінутнага перапынку адбыліся выбары дэлегатаў на агульны Зьезд Т-ва Б. Ш.

Сябрамі-дэлегатамі сходу, быў запрапанованы наказ для тых дэлегатаў, якія выбраны на агульны Зьезд. Наказ быў прыняты без папраўак.

Дэлегаты ад гурткоў зьвярнулі ўвагу на тое, што ў пачатку завешаньня Галоўнае Управы, Акружная Управа ня дала належнага кірунку ў гэтай справе. Акружная Управа, як кіраўнічая частка, зазнае, што гэта была зроблена ёю вялікае ўпушчэньне, але-ж гэта ўсё сталася так неспадзевана і раптоўна, што яна сама ня ведала, як пакіравацца. Цяпер, паклікаўшы прадстаўнікоў ад усіх куткоў Горадзенскага павету, Акр. Управа пры іх дапамозе і падтрыманьню ўсіх сяброў і гурткоў будзе цьверда змагацца за свае правы і за асьвету і культуру для цёмнага працоўнага беларускага люду.

Сход закончыўся гучным сьпевам нацыянальнага гімну „Ад веку мы спалі"!.. Здавалася, што ў гэтых цесных чатырох сьценах гымн вылівае скаргу ўсяго беларускага працоўнага народу:

„Усюды ганяюць, усюды сьмяюцца
Ну, проста хоць крыкні ратуй"!..

І гучным лоскатам стукнуліся аб сьцены новыя словы і вырваўшыся праз вокны панясьліся ў сьвет:

„Мы доўга цярпелі, цярпець больш ня будзем,
„Дык пойдзем-жа долю шукаць"!..

Па заканчэньні сходу быў запрапанованы падпісны ліст ахвяраў на Дом Беларускае Культуры ў м. Вільні.

Сабрана ўсяго 26 злот. 60 гр. і адаслана ў Беларускі Банк на конта № 17.

СЬПІС АХВЯРАУ.

Хомка Ілья—50 гр., М. Кашкевіч 50 гр., Мукасей С. 5 зл. 70 гр., Байкоўскі Аўг. 20 гр., Стальбоўскі М.—50 гр., Цэцко Р. 50 гр., Раманчук Уладз. 50 гр., Чобет Хвед. 60 гр. Прусак С.—60 гр., Кілейша Я.—50 гр., М. Войтла — 50 гр., Сіткевіч Ант. 20 гр., Б. Ул. — 50 гр., Курмін Міх. — 50 гр., Якубецкі М.—50 гр., Яз. Шышлюк—50 гр., Цывінскі Сьцяп.—40 гр., Курыловіч Уладз.—30 гр., Барада Янка—1 зл., Моцько М. 50 гр., Ламашэвічанка Е.—5 зл., Кізевіч П.—5 зл., Сяўрук П.—50 гр., Карпянюк О.—20 гр., Кліновіч—1 зл. Разам 26 зл. 60 гр.

Ад Рэдакцыі. Прыймаючы пад увагу цэнзурныя ўмовы і тое, што цяпер нешта не шанцуе нашай газэце за зьмяшчэньне рэзалюцыяў Сходаў Акружных Упраў Т. Б. Шк., Рэдакцыя мусіла выкінуць з гэтае карэспандэнцыі некаторыя месцы з пратэстам проціў рэпрэсіяў і зрабіць больш лагодны тон рэзалюцыі.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Далоў глупствы!

(В. Дубічы Царкоўныя, Бельскі павет).

У вёсцы Дубічы-Царкоўныя ў мінулым тыдні пасьля доўгіх запрошаньняў прыехаў „kierownik Stowarzyszenia Spożywców", дзеля заложэньня кааператыўнага склепу.

Як даведаліся сяляне аб гэтым, то хутка прышлі і адразу набралася каля 20 сяброў. Шмат яшчэ хто падпісаў-бы дэклярацыі, але на той час ня мелі грошаў, з поваду надыйшоўшых падаткаў. Далей вызначылі скляповага. „Kierownik" апавясьціў, што скляповы чалавек павінен быць адпаведны: добра граматны, бо ня толькі павінен умець зважыць і прадаць, але, апрача таго, весьці культурна асьветную працу, далей павінен быць сумленны і ня заняты гаспадаркай. Усе сябры аднагалосна ўказалі на жыхара Трахіма Панфілюка. Пасьля Тарас Тамашук пачаў кіраўніку набівацца сваім сынам Васькай, каб выбралі яго скляповым. Асабліва аб гэтым пачаў клапаціцца Павал Анасучук, бо ён сам хацеў быць скляповым, але ведаў добра, што сябры не дапусьцяць яму ўлезьці туды, то ён нашоў сабе сябру.

Так яны і зрабілі — два сябры проці волі ўсіх астальных. Сяляне, пабачыўшы такую няпраўду, абурыліся. Некаторыя з сяброў пачалі забіраць свае складкі назад.

Перад канцом сходу п. „kierownik" сказаў, што Трахім Панафілюк ня можа быць скляповым „z powodu podejrzania jego w polityce".

Статут „Stowarzyszenia Spożywców" аб гэтым нічога ня кажа і выняткаў розных ня мае, але ж што Статут, як новы скляповы зафундаваў сваім хадатаям абед з гарэлкай.

У такім выпадку гарэлка — не магла пашкодзіць нашаму новаму скляповаму ў яго бабтыстычным перакананьні. На колькі спачатку жыхары былі заахвоціўшыся за кааператыўны склеп, то цяпер на столькі зрабіліся апатычнымі, дзякуючы тэй камбінацыі з скляповым. Сорамна нам, браты, глупствам займацца!

Мы ўсе шчыра павінны ўзяцца за арганізацыю кааператываў, бо ў арганізацыі моц!

Дубіцкі.

Праца нашага каапэратыву

(В. В.-Кракотка, Слонімскага павету).

З балянсаў нашага каапэратыву відаць, што ў працягу 9 месяцаў каапэратыў зрабіў на 5187 зл. 46 гр. абароту, гэта значыць абярнуў сваім капіталам каля 10 разоў. Вынік такі: у першым годзе можна лічыць за добры. Абліччэньне склепу на 1. X.—28 г. выказала чыстага даходу 379,73 зл.

Каапэратыў моцна адчувае недастачу грошай да абароту. Дзякуючы маламу капіталу, каапэратыў змушаны рабіць частыя закупы ў горадзе, што пацягне за сабою вялікшыя затраты часу і грошай.

Аднак, паміма перашкод, якіх каапэратыў мае—дзякуючы недастачы капіталу—каапэратыў разьвіваецца. Сьвядомасьць сярод сялян расьце, як відаць з таго зацікаўленьня, якое выявілася на сходзе сяброў каапэратыву 14-га кастрычніка г. г.

Перад сабою каапэратыў мае шырокае поле дзеяльнасьці. Пакуль што каапэратыў вядзе працу толькі ў галіне спажывецкай. Аднак, на сходзе сяброў 14. X. 28 г. сяляне-сябры вельмі жыва абгаварвалі справу супольнага закупу сельска-гаспадарчых машын і штучных гнаёў да агульнага ўжытку.

Сяляне нарэшце зразумелі карысьць належаньня да каапэратыву. Супольным упорам, высілкамі сябры нарэшце збудуюць свой дабрабыт.

На чале ўправы каапэратыву стаяць энэргічныя і сумленныя людзі, дзейнасьцю іх і ахвярнай працай будучыня каапэратыву забясьпечана Сябра каапэратыву.

Як нам жывецца.

(м. Моўчадзь, Баранавіцкі пав.)

Паліцыя часта на нашым кірмашы вырабляе „штучкі".

Гэтак вось 10/X г. г. паліцыянт Моўчадзкага пастарунку п. Рончка ў селяніна з в. Карашкі, Лабора Дзям'яна, калі гэты быў адсутны, выцягнуў воз, запрог каня і кудысьці на ім паехаў.

Калі гаспадар вярнуўся, то яму сказалі, што конь і воз ягоныя арыштаваны. Гаспадар, доўга не чакаючы, пабег да пастарунку.

І вось маеш! Заходзіць каля пастарунку свой воз у дрэбязгі разьбіты, валяючыся на дарозе, а каня няма, якога толькі пазьней знайшоў у полі за местам. Там конь апынуўся таму, што паліцыянт прывязаў яго каля пастарунку за плот і калі йшоў аўтамабіль, то конь разам з возам і папаў пад яго. Конь неяк парваўшы ўсю збрую, вырваўся з-пад аўто, а воз разьляцеўся на шчэпкі.

Беднаму селяніну засталася толькі пад пагрозамі камэнданта і іншых паліцыянтаў (бо пана Рончкі ня было) сабраць шчэпкі і, пазычыўшы ў жыда воз, завязьці іх на зьбітым каню дамоў, і ў дадатак сказаць п. камэнданту сваё прозьвішча, каб потым заплаціць штраф. Дуброва.

Нам пішуць з вёскі яшчэ, што:

— У в. Крымна быў нейкі п. Б. сэкрэтаром гміны, а разам і сэквэстратарам. Езьдзіў ён па вёсках ды апісваў апошнія манаткі ў згалеўшых і так сялян. Але сколькі сяляне не плацілі падаткаў, усё-ж не хапала. Вось аднойчы прыяжджае кантроль. Зрабілі рэвізію. Па абліччэньню і праверцы ўсіх падатковых кніжак, аказалася, што перабору было зроблена на некалькі тысяч. Прыйшлося нашаму „дзеячу" іські за краты, але... знайшоўся „панок", які за яго паручыўся і ён застаўся на волі. Хутка быў вызначаны суд. Зьехалася вельмі шмат сьведак (пакрыўджаныя сяляне). Абвінавачаны вельмі спалохаўся, так што доктар прызнаў яго „псыхічна хворым". Суд адлажылі; калі будзе наступны—ня ведама.

Камэнтарыяў не патрэбна.

— У м-ку Моўчадзі, Баранавіцкага пав., на Усьпеньне поп Моўчадзкае царквы, абляяў сваіх парахвіян за тое, што яны не даюць ахвяр на царкву і накінуўся на тых сялян, якія пазналі ўжо папоўскую „праўду" і адвярнуліся ад яе. Праз поўгадзіны а. Мікалай пасылаў „пяруны і маланкі" на не паслушных „авечак", называючы іх цёмнымі людзьмі, закідваючы ім прыхільнасьць да дзяржавы, у якой не прызнаюць „храма божага", а „слугаў божых" як наш айцец, пераасьледуюць.

Цікава, што а. Мікалай не назваў дзяржавы, у якой „слугі божыя" перасьледуюцца! На сколькі нам ведама, то гэтых перасьледуюць у Мэксыцы за тое, што яны паўсталі з аружжам у руках, каб адбіць „свае" маёнткі, якія канфіскавала дзяржаўная ўлада. Але, як можна было судзіць з прамовы, а. Мікалай меў на думцы СССР, аднак, там „слугі божыя", здаецца, не перасьледуюцца, а толькі пазбаўлены ўрадавай дапамогі, паміраюць собскай сьмерцяй.

„Бязбожнікаў" ён абвінавачвае ў тым, што яны могуць ашукваць і наагул рабіць розныя „безбожныя дела". Але калі праглядзіць „цёмныя і яўныя" „дела" а. Мікалая, то лепшага „майстра" хіба ня знойдзеш. Бо хто не шкадуе жывых і мёртвых? — а. Мікалай! Хто ўзяў двайную плату за мэтрыку, а калі ў беднай жанчыны не хапіла да 20 зл. аднаго злотага, дык паслаў пазычаць да жыда,—а. Мікалай! Хто падчас шлюбу за 20-ці грашовую сьвечку бярэць злот?—а. Мікалай і г. д. і г. д.

Ня дзіва, што „авечкі" перастаюць быць авечкамі і пачынаюць абходзіцца і без айцоў Мікалаяў. Дзед Мацей.

З Радавае Беларусі.

Сярод пісьменьнікаў, паэтаў і літэратараў.

У сьнежні месяцы гэтага году адбудзецца дваццацігодьдзе літэратурнай дзейнасьці Цішкі Гартнага.

Для сьвяткаваньня юбілею пры Наркомасьветы БССР зложана камісія.

— Якуб Колас падрыхтаваў да друку другі том сваіх твораў. Першы том хутка выйдзе з друку ў Беларускім Дзяржаўным выдавецтве. Біяграфічна-крытычны артыкул да збору твораў Я. Коласа напісаў У. Дзяржынскі.

— З. Жулыновіч падрыхтаваў да друку зборнік крытычных-артыкулаў аб беларускай літэратуры: „Узгоркі і нізіны".

— Тодар Глыбоцкі здаў Белар. Дзяржаўнаму Выдавецтву зборнік сваіх літэратурна-крытычных нарысаў пад назвай: „Пра літэратурныя справы".

— Алесь Гародня напісаў новую п'есу-сатыру з жыцьця Зах. Беларусі пад назвай: „Пісар пана Куркуса". Гэты ж аўтар піша цяпер вялікі артыкул аб клясавай дыфэнцыяцыі ў беларускай літэратуры.

— Тэатр, мастацтва, музыка. Другі Беларускі Дзяржаўны Тэатр мае перарабіць для пастаноўкі ў наступным сэзоне апавяданьне Цішкі Гартнага: „Гаспадар". Сябра Аб'яднаньня пісьменьнікаў „Полымя" А. Ляжкевіч здаў у Беларускае Дзяржаўнае Кіно сцэнары „Пела вясна", паводле апавяданьня Якуба Коласа „На прасторах жыцьця". Хутка пачнуцца здымкі. Далей Ляжкевіч прыступае да апрацоўкі кіносцэнарыяў, паводле п'есаў Ц. Гартнага: „На стыку" і „Дзьве сілы".

— Пісьменьнікам А. Вольным напісаны для Беларускага Дзяржаўнага Кіно сцэнары карціны „Атаман Муха". Карціна мае быць гатовай к зіме бягучага году. А. Вольны працуе над камэдыяй з беларускага жыцьця, якую таксама набывае Беларускае Дзяржаўнае Кіно для пастаноўкі.

— Калегія Наркомасьветы Канчаткава вырашыла пытаньне аб арганізацыі ў Менску ў гэтым годзе беларускага дзіцячага кіно-тэатру. Апошні будзе знаходзіцца ў памяшканьні кіно-тэатру—„Пралетары". Тэатр будзе трымаць курс на арганізаванага гледача.

— Кіно-камітэт зацьвярдзіў сцэнары: „Пагранічныя слупы" з жыцьця пагранічных беларускіх вёсак, прадстаўлены групай маскоўскіх пісьменьнікаў і сцэнарыстых.

Рэдактар-Выдавец: П. Пяткун.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.